УДК 323.35:947(476)

# КАМІТЭТ ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯЎ І ПРАЕКТ АБ БУДАЎНІЦТВЕ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЦЭРКВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯГА КРАЮ Ў ДРУГОЙ ЧВЭРЦІ XIX ст.

**Лепеш Аксана Васільеўна**
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца праект Камітэта заходніх губерняў, вышэйшага тэрытарыяльнага камітэта па кіраванні Заходнім краем пасля паўстання 1830–1831 гг., па павелічэнню прэстыжу праваслаўя, што было заязана с будаўніцтвам цэркваў як на прыватных, так і на дзяржаўных землях.*

Пасля паўстання 1830–1831 гг. адным з прыярытэтным накірункаў палітыкі расійскага ўрада стаў напрамак па павышэнню прэтыжу праваслаўнай царквы ў заходніх губернях, дзе не было канфесіянальнага адзінства і дзе праваслаўе не з'яўлялася тытульнай рэлігіяй. Праграму па ўніфікацыі заходніх губерняў з унутранымі губернямі Расійскай імперыі было даручана распрацаваць створанаму ў 1831 г. Камітэту заходніх губерняў, у склад якого ўваходзілі вышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі, а таксама запрашаліся губернатары і генерал-губернатары Заходняга краю. Удзел у паўстанні шэрагу каталіцкіх і ўніяцкіх святароў, нізкі ўплыў праваслаўнай царквы выклікаў занепакоенасць з боку ўрада і прымусіў яго звярнуцца да абмеркавання мераў пра найлепшае ўладкаванне ў заходніх губернях царкоўнага кіравання на адных з першых пасяджэннях Камітэта заходніх губерняў – 10 і 18 лістапада 1831 г. Пры аналізе рэлігійнага пытання было адзначана, што палітычная неабходнасць прымусоўвае падтрымліваць у заходніх губернях, перш за ўсё, жыхароў праваслаўнай веры, таму што толькі яны больш за іншых "прывязыныя да расійскага прастолу і да ўсяго рускага" [1, л. 105]. У прыватных жа маёнтках, дзе ўладальнікамі з'уляліся памешчыкі-католькі, адбудаваны велічныя каталіцкія касцёлы, а праваслаўныя цэрквы, вернікамі якіх з'яўляліся сяляне, нагадвалі адну крушню драўляных будынкаў. Усё гэта не спрыяла распаўсюджанню праваслаўя у дадзеным рэгіёне. Узнять значнасць праваслаўнай царквы неабходна было, перш за ўсё, шляхам збудавання новых каменных цэркваў. Па меркаванні членаў Камітэта узводзіць паўсюдна праваслаўныя цэрквы неабходна было на казённых землях за кошт дзяржавы, на прыватных землях – за кошт саміх уладальнікаў, асабліва праваслаўных, на канфіскаваных землях – за кошт прыбыткаў з саміх гэтых зямель. Больш таго, як мясцовыя памешчыкі, так і самі вернікі павінны былі рамантаваць драўляныя цэрквы пры апекаванні з боку епархіяльнага начальства. Улады разумелі, што мясцовую эліту, якая была ў сваёй большасці каталіцкага веравызнання, прымусіць да будаўніцтва і рамонту праваслаўнях цэркваў будзе вельмі складана, і наўрад дзяржава зможа іх прымусіць ахвяраваць уласныя грошы на такую праграму. Пагэтаму адзіным сродкам стымулявання па ўзвядзенню праваслаўных храмаў у прыватных маёнтках была толькі сіла пераканання.

Пры абмеркаванні дадзенага пытання, члены Камітэта ўзнімалі праблему фінансавага стану праваслаўных святароў. Яны адзначалі, што праваслаўныя святары з-за адсутнасці забеспячэння з'яўляліся вельмі беднымі, знаходзіліся



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў поўнай залежнасці ад заможных уладальнікаў каталіцкага веравызнання. Палепшыць іх маёмасны стан можна было за кошт выплаты дапамогі ад Камісіі духоўных вучылішчаў, прыбыткаў ад канфіскаваных пасля паўстання каталіцкіх і ўніяцкіх манастыроў, дзесяціннага збору, частка якога павінна была пайсці на ўтрыманне праваслаўных цэркваў у заходніх губернях.

Аўтарытэт праваслаўнага святара быў неад'емна звязаны з яго інтэлектуальным узроўнем і магчымасцю эмацыянальна ўздзейнічаць на вернікаў. Члены Камітэта адзначалі недастатковы ўзровень адукаванасці духоўых праваслаўных асоб. З гэтай нагоды прпаноўвалася накіроўваць дзяцей праваслаўнага духавенства аддаленых заходніх губрняў у Кіеўскую, Перыяслаўскую і Чарнігаўскую губерні для атрымання неабходнага выхавання. А у заходнія губерні, асабліва на епіскапскія пасады, накіроўваць тых, хто атрымаў адукацыю ва ўнутраных губернях Расіі.

На практыцы мясцовыя дваране вельмі неахвотна выконвалі вусны загад па будаўніцтве праваслаўных цэркваў, а сіла перакананні на іх ніяк не дзейнічала. Указ імператара ад 19 лістапада 1832 г. аб абавязацельствах уладальнікаў будаваць і рамантаваць як уніяцкія, так і праваслаўныя цэрквы выклікаў у іх абурэнне. Напрыклад, у тым жа годзе памешчык Мінскай губерні Усцін Шырын у адказ на патрабаванне мясцовых уладаў прывесці ў парадак культавыя збудаванні праваслаўнага веравызнання, якія знаходзіліся ў яго маёнтку, падаў засядацелю Лабунцову заяву, дзе напісаў, што ўспрымае гэтыя распараджэнні губернскага начальства як дзеянні, недазволеныя законам [2, л. 6]. Да 1847 г. сітуацыя з нагоды папраўкі і ўзвядзення новых праваслаўных цэркваў па Мінскай губерні не змянілася. Мінскі арцыбіскуп Антоній пісаў, што яна “робіцца амаль заўсёды з вялікай цяжкасцю і павольнасцю”. Для паскарэння справы святар прапаноўваў нават сабраць грошы з сялян: па 15 кап. срэбрам на год з кожнай душы м.п. [3, л. 68-68 зв.]. Такая ж тэндэнцыя наконт узвядзення праваслаўных цэркваў назіралася і па іншых заходніх губернях.

Справа па будаўніцтве праваслаўных цэркваў у казённых маёнтках ішла больш дынамічна, паколькі фінансава падтрымлівалася дзяржавай. Яшчэ ў 1833 г. імператар распарадзіўся будаваць такія цэрквы ў Кіеўскай, Валынскай, Падольскай і Мінскай губернях, на што ахвяравалася сума ў 150 тыс. руб. на год. Будаўніцтва расцягвалася на 12-20 гадоў, у год планавалася ўзводзіць па 2 царквы. Першапачаткова Свяцейшы Сінод прызнаваў неабходным пабудаваць 8 цэркваў у Падольскай губерні, 3 – у Кіеўскай, 8 – у Валынскай і 2 – у Мінскай. Для кіраўніцтва праектам засноўваліся асаблівыя часовыя камітэты для пабудовы грэка-расійскіх цэркваў пад кіраўніцтвам генера-губернатараў, у абавязкі якіх ўваходзіла складанне плана і хода будаўнічых работ, вядзенне кантролю за працай падрадчыкаў і пастаўшчыкоў, складанне справаздачаў па выдатках на будаўніцтва [4]. Пасля стварэння Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў на яго ляглі праблемы збудавання цэркваў, а таксама нагляд за спыненнем усялякіх злачынстваў супраць праваслаўя ў казённых маёнтках. Так, згодна з загадам імператара 1846 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў павінна было ў заходніх губернях адрэстаўраваць 496 і пабудаваць 99 новых праваслаўных цэркваў пад пільным наглядам генерал-губернатараў. У загадзе адзначалася, што імператар незадаволены знешнім выглядам праваслаўных цэркваў, якія “не адпавядаюць хараству, падобнага да храма Божага”, а значыць і ў гэты час праграма па ўзвядзенні новых цэркваў і рэканструкцыі старых не была рэалізавана ў поўнай меры [5].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, праект Камітэта заходніх губерняў па будаўніцтву праваслаўных цэркваў пасля паўстання 1830–1831 гг. быў выкананы часткова. У прыватных уладаннях за ўласныя сродкі памешчыкі-каталікі не спяшаліся як рамантаваць, так і будаваць новыя культавыя пабудовы для праваслаўных вернікаў. На казённых землях пры фінансавай падтрымцы дзяржавы справа набывала хоць і больш дынамічны характар, але не адпавядала пастаўленым урадам задачам.

## Літаратура


1. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (РДГА). – Ф. 1266. Спр. 8.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 162.
3. РДГА. – Ф. 1266. Спр. 8.
4. Аб правілах для часовых камітэтаў па будаўніцтве грэка-расійскіх цэркваў у казённых паселішчах западных губерняў // ПСЗРІ. – 2-і збор. – Т. VI. – Аддз. 1. – № 11019.
5. Аб стварэнні праваслаўных цэркваў у паселішчах усановы дзяржаўных маёмасцяў у заходніх губернях // ПСЗРІ. – 2-і збор. – Т. VI. – Аддз. 1. – № 19910.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова